**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у X клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі у кадэцкіх вучылішчах**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

Асаблівае дрэва

Сярод дрэў, што растуць на нашай зямлі, дуб займае самае пачэснае месца. Людзі спакон вякоў, калі хацелі, каб хата стаяла доўга, будавалі яе на дубовых падрубах. Каб студня была надзейная, каб вада ў ёй не цвіла, была заўсёды чыстай, зруб рабіўся таксама з дубовых плашак.

Яго пускалі на шафы і шафкі, канапы і крэслы, ложкі і куфры. Дуб не гніў у вадзе, яго не браў шашаль, не шкодзілі яму ні вецер, ні сонца. А колькі казак, паданняў і легенд хадзіла ў народзе пра неверагодную сілу гэтага дрэва, пра вечную еднасць яго з роднай зямлёй!

У людзей склаўся класічны вобраз дуба: галінастае дрэва з таўшчэзным камлём і густой шапкай-кронай. Такім яго малявалі мастакі, такім яго мы бачылі ў школьных чытанках. І ва ўсе часы дуб быў сімвалам мужнасці, моцы і непахіснасці, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне разам з любоўю да роднай зямлі. (144 словы)

*Паводле Я. Пархуты*